**1998 Июнь 26 газета «Звязда»**

## ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ АПЛАДЗІРАВАЎ Д. ХВАРАСТОЎСКАМУ СТОЯЧЫ

**Бархатны барытон Дзмітрыя Хварастоўскага гучаў 23 чэрвеня ў Вялікім тэатры Беларусі. Адзіны канцэрт вядомага спевака ў Мінску стаў сапраўдным падарункам для беларускіх паклоннікаў вакальнага мастацтва.**

Сярод гледачоў, якія запоўнілі залу, быў у гэты вечар і прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка. Публіка была ў захапленні і доўга не хацела адпускаць спевака са сцэны, які выканаў на «біс» арыю Рыгалета і яшчэ адзін раманс. А сярод вялікай колькасці букетаў, што падарылі артысту, была і карзіна кветак ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Кіраўнік беларускай дзяржавы таксама не ўтойваў сваіх эмоцый. Яшчэ ў антракце, размаўляючы з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі, ён падзяліўся з імі сваімі ўражаннямі, назваўшы Дзмітрыя Хварастоўскага спеваком ад Бога і надзвычайным чалавекам. Прэзідэнт паабяцаў усе словы ўдзячнасці гледачоў перадаць спеваку ў час іх асабістай сустрэчы — яна адбылася пасля канцэрта.

Адзінае, аб чым выказаў шкадаванне Аляксандр Лукашэнка, што ў Беларусі няма такога выдатнага спевака. Праўда, ён спадзяецца, што падтрымка, якую аказвае дзяржава сферы культуры, нарэшце дасць плён і ў нас з'явіцца свой Хварастоўскі. Дарэчы, кіраўнік дзяржавы не раз бываў у Вялікім тэатры, прычым не толькі на канцэртах, але і на рэпетыцыях, і добра ведае праблемы яго калектыву. Прэзідэнт практычна ўзяў тэатр пад свой патранаж, што дало магчымасць крыху палепшыць матэрыяльнае становішча служыцеляў муз.

А ў хуткім часе, як паведаміў Аляксандр Лукашэнка, у Вялікім тэатры пачнецца капітальны рамонт, і яго трупа на нейкі час пераедзе ў будынак Палаца Рэспублікі.

**Эдуард ПІВАВАР, БЕЛТА.**

## Президент Беларуси аплодировал Д.Хворостовскому стоя

**Бархатный баритон Дмитрия Хворостовского звучал 23 июня в Большом театре Беларуси. Единственный концерт известного певца в Минске стал настоящим подарком для белорусских поклонников вокального искусства.**

Среди зрителей, которые заполнили зал, был в этот вечер и президент страны Александр Лукашенко. Публика была в восторге и долго не хотела отпускать певца со сцены, который исполнив на бис арию Риголетто и еще один романс. А среди большого числа букетов, подаренных артисту, была и корзина цветов от президента Республики Беларусь.

Глава белорусского государства также не скрывал своих эмоций. Ещё в антракте, общаясь с представителями творческой интеллигенции, он поделился с ними своими впечатлениямими, назвав Дмитрия Хворостовского певцом от Бога и чрезвычайным человеком. Президент пообещал все слова благодарности зрителей передать певцу во время их личной встречи-она произошла после концерта.

Единственное, о чем выразил сожаление Александр Лукашенко, что в Беларуси нет такого замечательного певца. Правда, он надеется, что поддержка, которую оказывает государство сфере культуры, наконец даст плоды и у нас появится свой Хворостовский. Кстати, глава государства не раз бывал в Большом театре, причем не только на концертах, но и на репетициях, и хорошо знает проблемы его коллектива. Президент практически взял театр под свой патронаж, что дало возможность немного улучшить материальное положение служителей муз.

А в скором времени, как сообщил Александр Лукашенко, в большом театре начнётся капитальный ремонт, и его труппа на какое-то время переедет в здание Дворца Республики.

Эдуард Пивовар, БЕЛТА.